ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1985

16 МАЯ

ЧАЦВЕР

№ 18 (1468)

ВЫДАЕЦЦА З 1922 ГОДА

Беларускі універсітэт

## ТЭЛЕТАЙП

УЧОРА · СЁННЯ · ЗАЎТРА

### СУСТРЭЧА З ГЕРОЕМ

— заўсёды падзея хвалюючая. Нядаўна ў гасцях у выкладчыкаў і лабарантаў кафедры псіхалогіі, а таксама ў студэнтаў курыруемага кафедрай зямляцтва рэспублікі Конга пабываў Герой Савецкага Саюза, доктар гістарычных навук, прафесар Дзмітрый Пятровіч Жмуроўскі. Адкрываючы сустрэчу, загадчык кафедры расказаў аб баявым шляху Д. П. Жмуроўскага.

У сваім выступленні Д. П. Жмуроўскі расказаў аб тым, якой цаной быў заваяваны мір для ўсіх пасляваенных пакаленняў савецкіх людзей, аб ратным подзвігу нашай арміі і працоўным гераізме савецкіх людзей у тыле, аб кіруючай ролі Камуністычнай партыі ў барацьбе з ворагам.

У гонар героя-ветэрана выканаў песні выкладчык кафедры рускай мовы па навучанню замежных студэнтаў, самадзейны кампазітар А. Ацьман. Студэнт 2-га курса філалагічнага факультэта Нсатунказі Арман Гі (Конга) прачытаў напісаны ім верш «Свабода». На сустрэчы чыталіся ўрыўкі з паэмы А. Твардоўскага «Васіль Цёркін», гучалі песні перыяду Вялікай Айчыннай вайны.

У знак высокай павагі ўдзельнікі сустрэчы ўручылі Герою Савецкага Саюза Д. П. Жмуроўскаму кветкі і памятны сувенір — беларускі рушнік з надпісам: «40 гадоў Перамогі».

Р. ВАДЭЙКА,
загадчык кафедры
псіхалогіі.

### ПА НОВАЙ ПРАГРАМЕ

закончылі трохгадовае навучанне па грамадзянскай абароне супрацоўнікі універсітэта. Першымі для здачы нарматываў і залікаў прыбылі работнікі універсітэцкай бібліятэкі.

Старшыня камісіі выкладчык С. В. Позняк знаёміць слухачоў з парадкам правядзення залікаў і задае пытанні. Затым экзаменуемыя практычна выконваюць нарматывы.

Глыбокія тэарэтычныя веды і практычныя навыкі паказалі супрацоўнікі М. А. Жыдкевіч, В. І. Ігнатава, Т. Л. Дудко, З. М. Шалупенка і многія іншыя.

Патрэбна адзначыць, што работнікі бібліятэкі адказна аднесліся да заняткаў, шмат часу ўдзялілі самастойнай рабоце. І як вынік — грунтоўныя веды ў аб'ёме ўсёй праграмы і неабходныя практычныя навыкі.

Л. МЕЛЬНІКАЎ,
начальнік штаба грамадзянскай абароны
універсітэта.

## РАЎНЕННЕ НА ПРАВАФЛАНГОВЫХ!



*Вясна...Доўгачаканая... Ты зноў прыйшла, зноў вярнулася са сваім непаўторным пахам чаромхі, з ціхім шэлестам маладога лісця, са звонкім хорам птушынага спеву...*

*На досвітку сонечны праменьчык весела заглядвае ў пакой: «Пара ўставаць!» Ён кліча за сабой на вуліцу. Хіба магчыма ў такі час залежвацца ў ложку або сядзець дома? Вясна на вуліцы... А тут у студэнтаў сесія. Пры адной толькі думцы, што патрэбна доўгія гадзіны праводзіць за падручнікамі, гартаць канспекты, становіцца сумна.*

*— Але не ўсім,— не згаджаецца студэнтка гістарычнага факультэта Ірына Янчына.— Калі студэнт добра вучыўся ў час семестра, калі падрыхтоўка да семінараў і практычных заняткаў была не аднаразовай справай, а нормай вучобы, то і сесію можна здаць без штурмаўшчыны.*

*Да думкі Ірыны варта прыслухацца: у яе залікоўцы выдатныя адзнакі. І ўменню правільна размяркоўваць свой час таксама можна павучыцца ў Ірыны. Ёсць ёй калі і камсамольскае даручэнне выканаць, і ў баскетбольным матчы за зборную факультэта выступіць, і справай любімай заняцца — танцамі і музыкай. І зараз у дзяўчыны добры настрой: на двары вясна, хутка пачнецца сесія. Поспехаў табе, Ірына!*

А. МАТУСЕВІЧ.
Фота А. ВАЛОШЫНА.

## З ЭВМ НА «ТЫ»

# ТРЭЦІ СУБЯСЕДНІК

КЛАС АТНС прымаў хімікаў. Ужо не першы раз гэта група прыходзіла сюды рашаць задачы. Патрэбна адразу сказаць: сістэма прымушае студэнтаў працаваць творча і робіць гэта не горш за самага строгага экзаменатара...

**— Цікава працаваць у гэтым класе, захапляюча, але вельмі складаныя былі сёння задачы, — прызналася пасля заняткаў студэнтка хімфака Вераніка Бурш. Такой жа думкі былі і яе сяброўкі з 6-й групы II курса.**

Што ж, сапраўды, машына адбірае і прапаноўвае для кожнай групы новыя заданні і строга, бескампрамісна ацэньвае веды. Тут не даводзіцца спадзявацца на тое, што даведаешся ўсё ад аднакурснікаў, якія ўжо выканалі гэтую работу. Застаецца даверыцца толькі самому сабе.

Аўтаматызаваная тэлевізійная навучальная сістэма (АТНС)— складаная і цікавая рэч. Знаёмства з ёю парушае прывычнае ўяўленне аб працэсе навучання. У наш час, час пачатку ўсеагульнай камп'ютэрызацыі, студэнт не слухае лекцыю, а чытае яе на дысплеі. Ён не рашае задачу на дошцы, а, рашыўшы яе ў сшытку, набірае рашэнне на дысплеі. Вось ён сеў за тэрмінал — пульт, які нагадвае сваёй клавіятурай пішучую машынку, і звязаны з ім тэлеэкран. Тэрмінал — мост паміж чалавекам і машынай.

Тут, націскаючы на клавішы, выкладчык уводзіць праграму — працуе ў аўтарскім рэжыме. На гэтыя ж клавішы націскае студэнт, калі адказвае на пытанні, уводзіць рашэнне задачы. ЭВМ уважліва кантралюе яго, вызначае правільнасць адказу, ацэньвае, падказвае, задае наводзячае ці дадатковае пытанне. Але гэта не значыць, што выкладчык застаўся ўбаку. Ён робіць самае галоўнае — удзельнічае ў складанні прагармы.

Сістэма павінна быць такой, каб ёю маглі карыстацца спецыялісты розных галін. І яна валодае многімі каштоўнымі якасцямі. Самае галоўнае — формулы і выказванні запісваюцца у традыцыйнай форме. Высокія ілюстрацыйныя здольнасці — можна перадаваць графічныя схемы і малюнкі, можна пры дапамозе відэамагнітафона суправаджаць матэрыял паказам тэлефрагментаў. Вучоныя БДУ імя У. І. Леніна распрацавалі «ДИСПАТОС» — спецыяльную дыялогавую сістэму высокага ўзроўню для работы на ЭВМ серыі ЕС. Пры складанні праграм для навучання не затрачваецца ні адной перфакарты, не пішацца нічога на машыннай мове. Прастата і зручнасць у рабоце — вось вартасці сістэмы. Таму ёю карыстаюцца фізфак і гістфак, мехмат і біяфак, не гаворачы ўжо пра ФПМ і факультэт радыёфізікі і электронікі.

Над АТНС, якая дзейнічае на базе ЭВМ ЕС-1022, разам працавалі лабараторыя АНС НДІ прыкладных фізічных праблем і кафедра электроннаматэматычных машын факультэта радыёфізікі і электронікі. Адна з першых у краіне мінская эксперыментальная сістэма распрацоўвалася ў рамках комплекснай праграмы па стварэнню аўтаматызаваных навучальных сістэм, якую ажыццяўлялі МінВНУ СССР і НДІ праблем вышэйшай школы.

АТНС — вынік супрацоўніцтва многіх таленавітых спецыялістаў. Над сістэмай пастаянна працуе творчая група вучоных, сярод якіх А. М. Мухарскі, А. І. Тарнапальскі, А. В. Арлоў, які займаецца матэматычным забеспячэннем.

У класах вывучаюць самыя розныя курсы — ад арганічнай хіміі да гісторыі КПСС і філасофіі. Існуюць і праграмы па замежных мовах. Сярод іх — прызначаная для тых, хто толькі пачаў вывучэнне яе або аднавіў заняткі пасля доўгага перапынку.

Вучоныя кафедры ЭММ старшыя навуковыя супрацоўнікі Л. У. Стрыкелева і А. У. Вавілава кантралююць ход вучэбнага працэсу, дапамагаюць выкладчыкам, распрацоўваюць разам з імі вучэбныя курсы. В. А. Лебедзеў сочыць за тэхнічным бокам. Невялікі калектыў эксплуатацыйнікаў дружна робіць сваю справу. Праходзяць групы. Змяняюцца праграмы. А яны ўважлівыя, сабраныя заўсёды. Яны стараюцца для таго, каб АТНС працавала, працавала надзейна, каб не перапынялася гэтая размова чалавека і машыны, якая дапамагае вучыць.

І зноў студэнты за тэрміналамі. І зноў на экране паяўляюцца словы, формулы, схемы. І націснуты клавіш: «Далей». Далей, да новых пытанняў і адказаў пераходзіць АТНС — трэці, але не лішні субяседнік, які ўступіў у вечны дыялог студэнта з выкладчыкам.

А. ПАТРЭБІН,
студэнт факультэта
журналістыкі.

ЗНАЁМІМ СА СПЕЦЫЯЛІЗАЦЫЯЙ

# НА СЛУЖБЕ — МІКРАПРАЦЭСАРЫ

КАРОТКІ ГІСТАРЫЧНЫ ЭКСКУРС. Паяўленне ў 1959 годзе першай інтэгральнай схемы азнаменавала сабой нараджэнне мікраэлектронікі — новага этапа развіцця электронікі. Дзякуючы ўдасканаленню інтэгральнай тэхналогіі і новым схематэхнічным рашэнням мікраэлектроніка прайшла за два дзесяцігоддзі шлях ад вырабу простых інтэгральных лагічных элементаў да стварэння вялікіх і звышвялікіх інтэгральных схем мікрапрацэсараў і мікра-ЭВМ. Такія схемы ўтрымліваюць на крышталі памерам у некалькі міліметраў дзесяткі і сотні тысяч транзістараў.

Важнейшым дасягненнем інтэгральнай тэхналогіі з'явілася стварэнне ў 1971 годзе мікрапрацэсара, які зрабіў сапраўдны пераварот у развіцці сродкаў аўтаматызацыі і вылічальнай тэхнікі. Гэта абумоўлена, у першую чаргу, нізкім коштам, кампактнасцю і надзейнасцю мікрапрацэсараў, а таксама магчымасцю праграмнага кіравання імі.

Выкарыстанне мікрапрацэсараў у розных сістэмах апрацоўкі інфармацыі дазваляе істотна павысіць надзейнасць і пашырыць функцыянальныя магчымасці сістэм пры адначасовым спрашчэнні іх абслугоўвання. Раней мікрапрацэсары выкарыстоўвалі для выканання арыфметычных аперацый у мікракалькулятарах. Зараз вобласць выкарыстання мікрапрацэсараў усё больш расшыраецца. Яны знаходзяць шырокае выкарыстанне ў прыладах для навуковых і медыка-біялагічных даследаванняў, у вымяральнай апаратуры, у аўтамабіле- і самалётабудаванні, бытавых прыладах, тэлевізарах, персанальных камп'ютэрах, карацей, практычна ва ўсіх сферах дзейнасці чалавека. Гэта, у сваю чаргу, ставіць новыя задачы перад ВНУ, якія рыхтуюць спецыялістаў па адпаведных спецыяльнасцях. Такі спецыяліст павінен арыентавацца ў пытаннях інтэгральнай тэхналогіі, фізікі паўправаднікоў і паўправадніковых прылад, валодаць глыбокімі ведамі ў галінах схематэхнікі, структурнай арганізацыі і г. д.

Усе гэтыя пытанні вывучаюць студэнты, якія займаюцца на кафедры электронных матэматычных машын па спецыялізацыі «Мікрапрацэсары і мікрапрацэсарныя сістэмы». Лекцыйны матэрыял падмацоўваецца курсавымі і лабараторнымі работамі па элементах, вузлах і структурах мікрапрацэсараў, рыхтуюцца новыя лабараторныя практыкумы па мікра-ЭВМ і дыялогавых вылічальных комплексах на базе мікра-ЭВМ.

Дзе ж будуць працаваць выпускнікі кафедры? Перш за ўсё на вытворчым аб'яднанні «Інтэграл», для якога ажыццяўляецца мэтавая падрыхтоўка спецыялістаў. Маладыя спецыялісты будуць таксама накіроўвацца і на іншыя прадпрыемствы горада і рэспублікі.

**С. МУЛЯРЧЫК,**
загадчык кафедры электронных матэматычных машын;
**В. ЛЕБЕДЗЕЎ,**
в. а. дацэнта кафедры.

...І ПЯЦЬ СТУДЭНЦКІХ ГАДОЎ

# «АБ ЧЫМ УСПОМНІШ?»





*Хутка пралятаюць студэнцкія гады! Чаму? Таму, што спраў надзёных багата, а за імі няўмольна бяжыць час. Вы, напэўна, памятаеце, як адчынілі першы раз дзверы свайго факультэта. Калі гэта было? Гады тры назад? Чатыры? Усе пяць?*

*У студэнтак фізфака Наташы Забелінай і Любы Бурлаковай зараз адказная пара — падрыхтоўка дыпломнай работы. Дзяўчаты выконваюць яе на кафедры біяфізікі. Многае могуць яны, азірнуўшыся на праляцеўшыя гады, успомніць*

*Давайце і мы азірнёмся.*

*Памятаеце першую сесію? Адны з вас ішлі ўпэўнена, маўляў, ведаю ўсё, чаго хвалявацца. Другія крыху сумняваліся, хоць і не спалі ночы перад экзаменам. Тут жа не так, як у шко-*

КАМСАМОЛЬСКІ ПРАЖЭКТАР

**Спытайце ў студэнтаў: «Што такое інтэрнат?» Адказы будуць самыя розныя. Кожны падкрэсліць іменна тое, што больш за ўсё запомнілася яму.**

**— Сябры і дыскатэка,— адкажа адзін.**

**— Вахцёр ля ўваходу і пропуск,— гэта думка другога.**

**— Пакой, у якім жывеш, і чытальная зала,— так вырашыць трэці.**

**Але можна, не пералічваючы ўсе папярэднія думкі і не адкрываючы нічога новага, адказаць адным ёмкім і простым словам: «Дом». Так, інтэрнат — гэта наш дом. А вось аб тым, ці ўмеем мы стварыць у ім дамашнюю ўтульнасць або проста навесці парадак, як у гэтым дапамагаюць жыльцам студсавет і адміністрацыя студгарадка — размова асобая.**

# ДОМ УТУЛЬНЫ?

ЧЛЕНЫ ШТАБА «Камсамольскага пражэктара» ў ходзе рэйду-праверкі агульнага стану інтэрнатаў універсітэта прыйшлі да вываду, што далёка не для ўсіх яны сталі ўтульным домам.

Вельмі часта непрыемнасці пачынаюцца ўжо пры ўваходзе ў інтэрнат. Паспрабавалі мы падняцца на дванаццаты паверх, але са здзіўленнем заўважылі, што ліфт адключаны. Аднак камендант інтэрната № 7 вельмі спакойна адносіцца да таго, што ліфт, як правіла, працуе толькі ў першай палове дня, і студэнты, якія вучацца ў другую змену, вымушаны пешшу падымацца на апошні паверх.

А зайшоўшы да сябе ў пакой, яны бачаць, што мыцца няма чым, няма на чым і прыгатаваць вячэру. Вады на верхніх паверхах інтэрнатаў № 2 і № 7 няма. Гэтаму студэнты, праўда, ужо не здзіўляюцца, таму што вады не было і раніцай. Здзіўляе іншае. Такое здараецца ў інтэрнатах ужо не першы год. За гэты час ад камендантаў, прафкома, дырэкцыі студгарадка, кіраўнікоў адміністрацыйна-гаспадарчай часткі жыльцы інтэрнатаў чулі няма-ла аб аб'ектыўных і суб'ектыўных прычынах недахопу вады. Значна менш гаварылася аб канкрэтных мерах, якія будуць прыняты. І зусім не відаць рэзультатаў ад прынятых мер.

Але, на жаль, часта і самі жыльцы не клапоцяцца аб падтрыманні парадку ў сваім доме. У ходзе рэйдаў члены штаба «Камсамольскага пражэктара» адзначаюць пакоі, санітарны стан якіх нездавальняючы. Толькі ў час апошняй выбарачнай праверкі ў інтэрнаце № 2 у нездавальняючым санітарным стане знаходзілася 17 блокаў і пакояў. Ва ўсіх інтэрнатах (акрамя шостага) на большасці пакояў няма шыльдачак з указаннем прозвішчаў жыльцоў. Замест іх на дзвярах пакояў часта можна ўбачыць надпісы рознага зместу. Не вельмі ветліва сустракае кожнага, хто прыходзіць у пакой 616 б, надпіс: «Ну, што трэба?» Многае могуць сказаць гэтыя надпісы і аб культурным узроўні жыльцоў пакояў. Складваецца ўражанне, што тая даволі рэгулярная работа, якую праводзяць студсаветы па кантролю за санітарным станам, не прыносіць дзейсных вынікаў. Вельмі рэдка прымаюцца да парушальнікаў парадку канкрэтныя меры, а яшчэ радзей аб гэтым даведваюцца ўсе жыльцы.

Пакідае жадаць лепшага арганізацыя дзяжурстваў па паверхах. Так, у інтэрнаце № 6 ужо своеасаблівай «традыцыяй» для дзяжурнага стала пакінуць на стале запіску «дзяжурны знаходзіцца ў пакоі №...» і знікнуць у невядомым напрамку. Паўстае пытанне: ці патрэбна наогул такое дзяжурства?

На жаль, часта дзяжурныя па паверхах не выконваюць і іншыя свае абавязкі. Нярэдка яны забываюць аб неабходнасці падтрымліваць парадак на кухнях. Здавалася б, там павінна быць узорная чысціня, а на справе атрымліваецца наадварот. Чаго толькі не ўбачыш на кухні! І горы папяровых пакетаў, і бульбяныя шалупайкі. Вельмі часта студэнты ператвараюць кухонныя сталы ў сховішчы для харчовых адходаў. Так здараецца таму, што ў інтэрнатах няма бачкоў для адходаў. Доўга не вывозяцца астаткі прадуктаў харчавання з двара інтэрната № 4.

Часта парушаюць студэнты і тэхніку бяспекі. У інтэрнаце № 7 члены штаба «Камсамольскага пражэктара» пачулі на кухні пах газу. У памяшканні было пуста. І нікому не было справы да ўключаных, але не запаленых гарэлак на газавых плітах. А спусціўшыся на адзін паверх ніжэй, мы пераканаліся, што калі б здарыўся пажар, тушыць яго не было б чым — вогнетушыцелі выкарыстоўваліся ў якасці падпорак для тэніснага стала. Адзін з аўтараў гэтага артыкула правёў выпрабаванне аднаго з іх па метаду, апісанаму Ільфам і Пятровым у «Двенадцати стульях»,— і з тым жа рэзультатам! З вогнетушыцеля вырвалася слабае шыпенне, і ён выліў на падлогу крышку брудна-бурай вадкасці.

Зараз некалькі слоў пра эканомію і беражлівасць. Калі ў некаторых інтэрнатах пра такія паняцці забылі, то ў інтэрнаце № 3 за гэта актыўна ўзяліся і студэнты, і студсавет. Спачатку яны выкруцілі больш паловы лямпачак у калідорах і на кухні. Зараз, праходзячы вечарам па калідоры, не пазнаюць адзін аднаго нават самыя лепшыя сябры.

**У час праверак штаб «Камсамольскага пражэктара» вымушаны фіксаваць адны і тыя ж недахопы, і складваецца ўражанне, што для іх ліквідацыі мала што робіцца. Але зададзім пытанне і жыльцам інтэрнатаў: «Няўжо не час забыць пра формулу: не маё і прыбіраць не патрэбна»? Забыць, і ўсім разам вымыць вокны (на жаль, не памылі іх у час суботніка ў інтэрнаце № 4). Забыць, і прывесці ў парадак ліфтавыя, калідоры, лесвіцы, чытальныя залы. І ператварыць інтэрнат у дом утульны.**

**Ю. ВАРАТНІЦКІ,**
старшыня штаба «Камсамольскага пражэктара» універсітэта.
**М. ЗАГОРСКАЯ,**
старшыня штаба «Камсамольскага пражэктара» факультэта журналістыкі.

*ле. Выкладчыкі сур'ёзныя. Часам нехта хвалявауся: «Ой, дзяўчаты, а раптам «хвост»?» А чацвёртакурснікі і пяцікурснікі заспакойвалі: «Ну, чаго раскіс? Хуценька вазьмі сябе ў рукі. Экзаменатар — выдатны чалавек. Толькі на лекцыях строгі».*

*... І вось прайшла адна сесія, другая. чацвёртая. шостая. Цяпер мы заспакойваем першакурснікаў, што хвалююцца перад дзвярыма з шыльдачкай «Цішэй, ідзе экзамен!».*

*А ці былі ў вас вечары першакурснікаў, медыумы, дні факультэта?.. Колькі клопатаў у час падрыхтоўкі да іх.*

*— Валодзя, калі будзеш распрацоўваць сцэнарый? — за тры месяцы да мерапрыемства пачынаюць дапытвацца аднакурснікі.*

*І Валодзя, адклаўшы ўбок усе справы, падключыўшы да гэтага з дзесятак сяброў, пачынае «тварыць».*

*— Мастакі, афармленне залы за вамі. Газета таксама.*

*І некалькі дзён запар схіляюцца дзяўчаты да ночы над велізарнымі ватманамі. І не проста малююць, а ўкладваюць у справу ўвесь свой густ, багаты гумар, талент.*

*Турбот хапае. Але калі вечар атрымліваўся, радаваліся ўсе.*

*А як весела было, калі збіраліся разам! Колькі разоў усёй групай хадзілі ў паходы, на экскурсіі. Часта гулялі па гораду або выходзілі на вуліцы Мінска ў святочнай першамайскай калоне.*

*Былі і такія, што адмаўляліся ад усяго, мяўляў, лепшы адпачынак — нічым не займацца. Але большасць жылі змястоўным, напоўненым жыццём. Хто застаўся ў выйгрышы?*

*Вядома, апошнія. Бо толькі яны, нават праз дзесяткі гадоў, змогуць з радасцю і нейкім асаблівым хваляваннем сказаць былому аднакурсніку:*

*— А памятаеш?..*

***Л. ТРАФІМОВІЧ,***
***выпускніца факультэта журналістыкі.***





***НА ЗДЫМКАХ:***
***хутка — вечар;***
***на першамайскай дэманстрацыі;***
***студэнткі фізфака Наташа Забеліна і Люба Бурлакова за падрыхтоўкай дыпломнай работы.***

***Фота А. ВАЛОШЫНА.***

**ВЕКАПОМНАЕ**

# МІНУЛАЕ НЕ МАЎЧЫЦЬ

БОЛЬШ ЗА ДЗЕСЯЦЬ гадоў актыўна працуе ва універсітэце пошукавая група «Доўг». У яе ўваходзяць 115 чалавек — прадстаўнікі ўсіх факультэтаў. Асноўная мэта работы — знайсці былых студэнтаў і выкладчыкаў універсітэта, якія змагаліся на франтах Вялікай Айчыннай вайны, а таксама партызан і падпольшчыкаў, увекавечыць іх памяць. Назва групы гаворыць сама за сябе: адшукаць тых, хто выконваў свой патрыятычны абавязак у гады вайны — гэта наш доўг сёння. На яркіх прыкладах з гераічнага мінулага выхоўваць у моладзі павагу да подзвігу старэйшага пакалення, вернасць і любоў да Радзімы.

Большасць былых студэнтаў і выкладчыкаў універсітэта ваявалі ў гады ваеннага ліхалецця ў 300-й партызанскай брыгадзе імя Варашылава, якая была сфарміравана ў лістападзе 1942 года і дзейнічала на тэрыторыі Капыльскага і Узденскага раёнаў. Следапыты пачалі пошук. А ў маі 1981 года адбылася першая сустрэча партызан гэтай брыгады. Сабралася каля 100 былых воінаў. Ветэраны вайны сустрэліся з моладдзю, наведалі месцы былых стаянак у Лаўскім лесе, усклалі вянкі да помніка загінуўшым воінам-партызанам.

У снежні 1982 года было вырашана стварыць штаб па арганізацыі сустрэч ветэранаў вайны, куды б увайшлі прадстаўнікі савета ветэранаў вайны і камітэта камсамола універсітэта.

З 1983 года сустрэчы ў Лаўскім лесе сталі традыцыйнымі. На іх прысутнічаюць і замежныя студэнты, якім таксама давялося ў сябе на радзіме змагацца са зброяй у руках.

Членам пошукавай групы ёсць чым ганарыцца. Толькі за мінулы год яны ўстанавілі больш за 200 імёнаў герояў. Усе матэрыялы перададзены ў музей гісторыі універсітэта. Члены групы ўдзельнічаюць таксама ў складанні «Летапісу камсамольскай славы універсітэта», устанавілі і падтрымліваюць сувязі з сакратарамі камітэта камсамола БДУ імя У. І. Леніна мінулых гадоў. Тэматычныя стэнды, работа ў архіве, шэфства над ветэранамі вайны і працы... Шмат іншых добрых і карысных спраў на рахунку следапытаў.

У апошнія гады дзейнасць групы значна пашырылася. У сакавіку 1982 года сабраліся байцы першага цаліннага атрада. Сярод іх быў Я. М. Бабосаў, былы сакратар камітэта камсамола універсітэта, зараз член-карэспандэнт Акадэміі навук БССР, дырэктар Інстытута філасофіі і права АН БССР.

Шмат планаў і задум у членаў пошукавай групы «Доўг» і зараз. Яны добра памятаюць словы: «Ніхто не забыты, нішто не забыта!». І сваёй карпатлівай і стараннай дзейнасцю робяць усё для таго, каб ні адзін герой не застаўся невядомым.

Зараз следапыты збіраюць матэрыялы, каб ажыццявіць запаветную мару: стварыць музей камсамольскай славы універсітэта. Загарэліся гэтай ідэяй Аляксандр Жаляхоўскі, Ігар Заплечнікаў, Вольга Запольская, Ігар Тарнавецкі, Анатоль Леванюк, Ігар Абадкоў і многія іншыя следапыты пошукавай групы «Доўг».

**Н. КАТКОВА.**

**ФАКУЛЬТЭТ ГРАМАДСКІХ ПРАФЕСІЙ**

# ПРАБЛЕМЫ ПАТРАБУЮЦЬ ВЫРАШЭННЯ

**Аднойчы давялося пачуць размову дзвюх студэнтак-сябровак.**

**— Навошта нам патрэбны гэты ФГП? — узрушана пыталася адна.**

**— Не ведаю, але ж без вучобы на ім, гавораць, палітзалік цяпер не атрымаеш,— адказала другая.**

**— Ну, то на якое аддзяленне запішамся?**

НЕ ВЕДАЮ, што вырашылі дзяўчаты, не стала дапытвацца і пасля, на якім аддзяленні яны займаюцца. Проста захацелася высветліць, што азначаюць для студэнтаў гэтыя тры літары — ФГП? Прадбачу, нехта ўсміхнецца: «Вынайшла загадку. Гэта ж факультэт грамадскіх прафесій». Стоп. Давайце спачатку знойдзем, дзе ён знаходзіцца. Аказваецца, адшукаць яго не так проста. Першы арыенцір — галоўны корпус, другі — чацвёрты паверх, а далей... Нават у камітэце камсамола дакладна не ведалі: «Шукайце на чацвёртым».

Удалося знайсці стэнд «ФГП інфармуе». Вось дзе павінен быць адказ на ўсе мае пытанні. Але ж з невялічкага аркуша паперы з раскладам заняткаў аддзяленняў мала аб чым можна даведацца.

Кожны факультэт мае сваю наглядную агітацыю. Але пакуль што няма такога на дванаццатым факультэце. Адсутнасць дастатковай агітацыі тлумачыць тое, што аб ФГП многія доўгі час не ведаюць.

Між тым лічыцца і, відаць, не без падстаў, што ФГП патрэбны і цікавы для ўсіх студэнтаў. Ён дапамагае авалодаць другой спецыяльнасцю, садзейнічае развіццю грамадскай актыўнасці моладзі, расшырае кругагляд, веды студэнтаў. «Неруш», «Крыжачок», групы «Доўг», «Пошук» — вядомыя калектывы, у якіх удзельнічаюць і выпускнікі факультэта грамадскіх прафесій.

Пытанне набору студэнтаў — цэнтральнае. Колькасць жадаючых займацца на факультэце значна адстае ад планавых лічбаў набору. Вось і вымушаны на факультэтах пагражаць дрэннай адзнакай па грамадска-палітычнай практыцы тым, хто не жадае авалодаць другой спецыяльнасцю. У выніку каго хвалюе адзнака, згодны запісвацца на любое аддзяленне. Толькі ці будуць яны наведваць заняткі пасля таго, як пройдзе атэстацыя,— іншае пытанне.

Здараецца і такое. Спісы складаюцца без ведама студэнтаў і накіроўваюцца ў дэканат. Відавочна, што такія «мёртвыя душы» на заняткі не прыходзяць. Фактычна ж лічыцца, што план па набору студэнтаў выкананы.

І нават з тых, хто з ахвотай прыходзіць на ФГП і спачатку займаецца з цікавасцю, толькі трэцяя частка атрымлівае пасведчанне аб заканчэнні. Часцей за ўсё «адсейваюцца» праз некаторы час першакурснікі, якія, не разлічыўшы сіл, запісваюцца адразу на некалькі аддзяленняў. Шмат залежыць і ад дысцыплінаванасці студэнтаў. Асноўныя заняткі яны наведваюць старанна, а на ФГП прыходзяць праз раз, а то і радзей. Лічаць гэта справай другараднай. А потым наогул забываюць дарогу на факультэт, скардзяцца, што там нецікава.

Вялікую ролю ў рабоце са студэнтамі павінен адыгрываць старшыня ФГП на факультэце. Ён з'яўляецца непасрэдным злучальным звяном паміж дэканатам і навучэнцамі. І ад яго ўмення заахвоціць, дапамагчы ў выбары спецыяльнасці залежыць нямала. Пакуль што не ўсе старшыні ФГП добра выконваюць свае абавязкі. Усім патрабаванням адпавядае работа толькі на гістфаку і механіка-матэматычным факультэце.

Дзейнасць старшынь ФГП не павінна абмяжоўвацца толькі складаннем спісаў і кантролем за наведваннем заняткаў. Яна не спыняецца і тады, калі студэнт атрымаў пасведчанне. Камітэту камсамола неабходна своечасова далучыць студэнта да грамадскай работы. Што ж атрымліваецца на справе? Студэнты, якія ўваходзяць у камсамольскі актыў, не жадаюць вучыцца на ФГП. Так, у кожнай факультэцкай арганізацыі ёсць свае лектары. Але на заняткі школы маладога лектара прыходзяць адзінкі.

Ці вось яшчэ адзін прыклад. З кожным годам ва універсітэце павялічваецца колькасць педагагічных атрадаў. На ФГП ёсць аддзяленне арганізатараў работы з дзецьмі і падлеткамі, асноўная задача якога — рыхтаваць важатых для работы ў летніх піянерскіх лагерах. З ахвотай займаюцца тут многія студэнты. А летам аказваецца, што месца ў піянерскім лагеры, падрыхтаванае для выпускніка ФГП, ужо занята... байцом педатрада. Такім чынам атрымліваецца, што тэарэтычна падрыхтаваныя слухачы факультэта застаюцца без практыкі, а важатым не хапае тэарэтычнай падрыхтоўкі. Ці не лепш было б праводзіць падрыхтоўку байцоў педатрадаў на базе ФГП? На жаль, аб гэтым яшчэ пакуль што не было гаворкі ў камітэце камсамола універсітэта, хаця факультэт створаны ў якасці падрыхтоўчай базы для грамадскіх работнікаў і сувязь паміж гэтымі арганізацыямі павінна быць самай непасрэднай.

Так, праблем шмат. У тым ліку і гаспадарчых. Але самае галоўнае — давесці студэнтам, што ФГП для іх — не проста непатрэбны дадатак да асноўнага вучэбнага працэсу, а тое, што неабходна кожнаму.

**З. МАРЫНІНА,**
**студэнтка факультэта журналістыкі.**

# ЛЁГКІХ ПЕРАМОГ НЕ БЫВАЕ




ЗАКОНЧЫЛАСЯ рэспубліканская міжвузаўская шахматная спартакіяда, у якой прымала ўдзел і каманда нашага універсітэта. У выніку жэраб'ёўкі ў падгрупу «А» трапілі амаль усе мецнейшыя студэнцкія зборныя рэспублікі, таму барацьба за першае месца і выхад у фінал была асабліва напружанай. Наша каманда, аднак, здолела падтрымаць баявы настрой і выйграла ўсе матчы ў падгрупе, у тым ліку перамагла і зборныя ІФК, БДІНГ і БПІ.

У фінальным матчы за першае месца прайшла сустрэча са зборнай тэхналагічнага інстытута, якая значна ўступала сваім майстэрствам нашай камандзе. Вось тут і адыграў сваю ролю розны настрой удзельнікаў. Большасць нашых шахматыстаў лічылі, што першае месца ім забяспечана, і настроіліся на лёгкую перамогу ў сустрэчы са «слабым» сапернікам. А інакш чым можна растлумачыць той факт, што ў гэтым фінальным матчы наша каманда прайграла тры сустрэчы. Амаль столькі, колькі ва ўсіх паўфінальных паядынках.

У выніку чэмпіёнам спартакіяды стала каманда тэхналагічнага інстытута, а нашы шахматысты — на другім месцы. На трэцім — каманда інстытута народнай гаспадаркі. Вынікі спаборніцтва яшчэ раз пацвердзілі старую спартыўную ісціну, што за перамогу патрэбна змагацца да апошняга.

**Л. ЛЕВІТ,**
**трэнер зборнай універсітэта па шахматах.**

**Фота А. ПАНІНА.**




**Намесніка дэкана факультэта радыёфізікі і электронікі Сяргея Гаўрылавіча Няклява часта можна бачыць на факультэцкіх і універсітэцкіх спартыўных спаборніцтвах. Ён не проста назіральнік. Сяргей Гаўрылавіч перажывае за сваіх студэнтаў, радуецца іх поспехам.**

# КЛОПАТ НА КОЖНЫ ДЗЕНЬ

**— Што прымушае Вас праяўляць такі інтарэс?**

— У маладосці я актыўна займаўся спортам. Асабліва любіў лыжы, выступаў на чэмпіянатах Узброеных Сіл СССР. І цяпер не пакідаю дружбы са спортам. Удзельнічаю ў факультэцкіх спаборніцтвах і нават займаю прызавыя месцы сярод выкладчыкаў, нягледзячы на свой немалады ўзрост. Хочацца пабыць з маладымі, адчуць сябе бадзёрым і здаровым. Зразумела, што і як намеснік дэкана я павінен удзяляць увагу развіццю фізкультуры і спорту на факультэце. Зусім па-іншаму стараюцца студэнты, калі бачаць, што ў іх рэзультатах зацікаўлены.

**— Сяргей Гаўрылавіч, што даюць студэнтам заняткі фізкультурай і спортам?**

— Перш за ўсё — здароўе. Нам важна, каб студэнт заўсёды быў здаровы, і заняткі фізкультурай і спортам гэтаму садзейнічаюць.

Студэнты, выступаючы за каманды курса, факультэта, універсітэта, пранікаюцца пачуццём адказнасці за свой калектыў, яны цэняць дружбу, павагу да таварышаў.

**— Многія факультэты зайздросцяць, што ў Вас ёсць студэнты, якія могуць добра і ўмела працаваць у саставе спортбюро.**

— А чаму тут зайздросціць? Мы шукаем такіх. Некалькі гадоў назад прыгледзеліся да Анатоля Кулінкі. Высокіх спартыўных вынікаў ён не паказваў, але заўсёды актыўна ўдзельнічаў у факультэцкіх спаборніцтвах. Выбралі яго старшынёй спортбюро. І хлопец паказаў зайздроснае стараннe. Не толькі арганізатарскае: пяцікурснік — член зборных факультэта па валейболу, лыжных гонках, футболу. На змену Анатолю мы доўга падбіралі кандыдатуру. Спыніліся на чацвёртакурсніку Канстанціне Жураку. Не памыліліся. Многа добрых слоў трэба сказаць аб дзейнасці Валодзі Дзікевіча, Гены Саука, Андрэя Чарняхоўскага, Ігара Віннічка, Сяргея Быкава, Гены Прыбытка, Сяргея Тырсікава. Дарэчы, Сяргей у гэтым навучальным годзе стаў чэмпіёнам БССР па класічнай барацьбе.

**— Масавасць — характэрная рыса мерапрыемстваў, якія праводзяцца на факультэце. Гэта праяўляецца і ў спартыўных спаборніцтвах.**

— Для нас важнейшая задача — ахапіць заняткамі фізкультурай і спортам большую колькасць студэнтаў і выкладчыкаў. Наш факультэт размешчаны далёка ад галоўнага корпуса, таму студэнты не могуць актыўна наведваць універсітэцкія спартыўныя секцыі. Але мы выходзім са становішча.

На факультэце на грамадскіх пачатках працуюць секцыі па валейболу, баскетболу, шахматах, шашках, настольнаму тэнісу, агульнай фізічнай падрыхтоўцы і рытмічнай гімнастыцы.

**— Сяргей Гаўрылавіч, ці не зашмат часу забірае спорт у студэнтаў?**

— Мы дабіваемся, каб спорт стаў актыўным памочнікам у вучобе і жыцці. Многія нашы спартсмены выдатна спраўляюцца з вучэбнымі нагрузкамі. Алег Драздоўскі, член зборнай Белсавета ДСТ «Буравеснік» па лёгкай атлетыцы, чацвёрты год запар займаецца толькі выдатна, з'яўляецца старастай групы. А пяцікурснікі В. Цыбулька, А. Кулінка, А. Чарняхоўскі маюць у залікоўках пяцёрак значна больш, чым чацвёрак.

**— Факультэт радыёфізікі і электронікі «нацэліўся» сёлета на прызавое месца ў спартакіядзе універсітэта. Якога ж канчатковага выніку чакаць?**

— Час пакажа. Пакуль мы ідзём на другім месцы, але не сказалі яшчэ апошняе слова юрфак, фізфак, геафак, ФПМ. Як бачыце, сапернікі сур'ёзныя, не раз бывалі пераможцамі і прызёрамі спартакіяд. Выключэнне складае геаграфічны факультэт, дзе ў апошнія гады, як і ў нас, адбываюцца зрухі наперад.

Інтэрв'ю правёў
**У. АБРАМОВІЧ.**




# *ВУЧЫСЯ КІРАВАЦЬ САБОЙ*

*(Працяг. Пачатак у №№ 14, 15).*

У ВЫНІКУ пастянных трэніровак вы адчуеце, што ў час супакаення мышцы канечнасцей, і асабліва рук, становяцца цеплымі і цяжкімі, як быццам наліваюцца свінцом. Гэта і ёсць сігнал пераходу да наступнага практыкавання, якое дапаможа выпрацаваць у вас уменне расслабляць мышцы ўсяго цела. Расслабленыя мышцы робяцца больш цяжкімі і цяплеюць (памяншаецца іх цеплааддача). Таму калі вы навучыцеся выклікаць адчуванне цяжару і цяпла спачатку ў мышцах канечнасцей, а затым у мышцах цела, вы ў той жа час навучыцеся адвольна расслабляць гэтыя мышцы. Выклікаць яркія ўяўленні цяжару і цяпла ў мышцых дапамогуць вам наступныя моўныя формулы.

**Формула «цяжару ў мышцах рук»**

Я спакойны... Я зусім спакойны...

Мая правая рука цяжкая...
Правая рука вельмі цяжкая...
Я адчуваю прыемны цяжар у правай руцэ...

Правая рука прыемна ацяжалела...

Рука цяжкая... Цяжкія рукі...
Цяжар рук...

Прыемны цяжар напоўніў рукі...

Цяжкія рукі...

Можна пачынаць гэта практыкаванне і з унушэння цяжару ў левай руцэ (калі вы ляўша).

Пасля таго як адчуванне цяжару ў руках стала злёгку ўзнікаць, пераходзьце да самаўнушэння цяжару ў мышцах ног.

**Формула «цяжару ў мышцах ног»**

Я спакойны... Я зусім спакойны...
Я адчуваю прыемны цяжар ног...

Ногі ацяжалелі...
Адчуваю цяжар правай нагі...
Правая нага цяжкая...
Адчуваю цяжар левай нагі...

Левая нага цяжкая... Ногі цяжкія...

Прыемны цяжар ног...
Цяжар і цяпло...

Прыемнае цяпло ахутала мяне...

Прамежак 10—15 секунд, у час якога ўявіце ўсе, што з вамі рабілася ў час формулы.

Пасля аднаго-двух тыдняў такіх трэніровак можна прыступіць да наступнага практыкавання АТ, накіраванага на самаўнушэнне цяпла ў мышцах рук і цела.

**Формула «цяпла»**

Я спакойны.. Я зусім спакойны...
Правая рука прыемна цяжалее...
(ляўшы можна пачынаць з левай рукі)
Мая правая рука прыемна пацяплела...
Я адчуваю прыемнае цяпло ў правай руцэ...
Прыемнае цяпло струменіць у правую руку...
Прыемнае цяпло струменіць праз плячо...
Локцевы сустаў... прадплечча... кісць...
Да кончыкаў пальцаў...
Прыемнае цяпло ў руках...
Цяпло...
Прыемнае цяпло...
Прамежак — 10—15 секунд.
Цяпло у правай (левай) руцэ...
Цяпло ў левай (правай) руцэ...
Цяпло ў маіх нагах...
Правая нага цёплая...
Левая нага цёплая...
Ногі прыемна пацяплелі...
Прыемнае цяпло у маім арганізме...
Прамежак — 10—15 секунд.
Я спакойны...
Я зусім спакойны...

Не адчайвайцеся, калі ў вас што-небудзь не атрымаецца. Памятайце, што час, патрачаны на вывучэнне пытанняў аутагеннай трэніроўкі, акупляецца ў сто разоў. І не кідайце пачатую справу на палавіне шляху. Улічыце, што аваладанне навыкамі псіхалагічнай самарэгуляцыі падобна пад'ёму па канату. Практыкуючыся, вы падымаецеся ўверх усё вышэй і вышэй. але як толькі вы перасталі займацца і апусцілі рукі — вы спаўзлі ўніз, і трэба пачынаць усё спачатку...

**Г. МАЗО,**
урач-псіхатэрапеўт.

(Заканчэнне будзе).


БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Мінская паліграфічная фабрыка «Красная звезда» МВПА імя Я. Коласа.

16 мая 1985 г.
Зак. 2531. АТ 13341.

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

В. а. рэдактара З. А. АЛЯШКЕВІЧ.